

# Гродзь Яніна Станіславаўна

Галоўны бухгалтар КСУП «Гудагай» Яніна Гродзь.

– Хто паведаміў, што ваш партрэт трапіў на Дошку гонару і што пры гэтым адчулі?

Яніна Станіславаўна:

– Даведалася ад нашага спецыяліста па ідэалагічнай рабоце Вікторыі Юргелянец. Для мяне стала прыемнай нечаканасцю, што на такім узроўні ацанілі маю работу. Удзячна кіраўніцтву і ўсяму калектыву нашага КСУПа.

- Чаму на Дошку гонару заносяць партрэт даяркі ці механізатара, зразумела. А за якія заслугі ў ганаровую галерэю, думаеце, трапіла ваша прозвішча? І якія крытэрыі вызначаюць паспяховасць дзейнасці галоўнага бухгалтара?

Яніна Станіславаўна:

– Многія фактары: своечасовасць прадстаўлення справаздач, балансаў і іншай дакументацыі. Таксама, на мой погляд, улічваецца стаж работы – у сельскай гаспадарцы працую 38 гадоў.

Яніна Станіславаўна:

– Пасля Ашмянскага сельскагаспадарчага тэхнікума мяне накіравалі ў калгас імя Калініна (Дайлідкі) – гэта было 1 жніўня 1984 года. Старшынёй быў Віктар Іванавіч Ярмак, галоўным бухгалтарам – Марыя Мар'янаўна Сяргей. Удзячна ім за дапамогу і слушныя падказкі. Пасля 16 гадоў работы мяне прызначылі галоўным бухгалтарам – было гэта ўжо пры Далговічы.

Напачатку было боязна: весці ўсю бухгалтэрыю калгаса – адказна. Бачучы маю разубленасць, Валерый Часлававіч пацікавіўся, ці ўмею выпісваць даверанасці. Кіўнула галавой. А ён кажа: «Ну дык усё атрымаецца! Няма чаго хвалявацца».

У 2009 годзе «Дайлідкі» далучылі да «Гервят», а мне прапанавалі пасаду галоўнага бухгалтара ў СВК імя Гашкевіча – пайшла. У 2012 годзе наш калгас далучылі да «Гудагая». Без уліку ўсіх гэтых рэарганізацый у маёй працоўнай кніжцы толькі некалькі запісаў. Дарэчы, камп’ютарныя праграмы, у тым ліку 1С, пачалі асвойваць дзесяць гадоў назад, да гэтага ўсю бухгалтарскую дакументацыю вялі ўручную. Калгас вялікі, аб’ёмы работы – таксама. Кожнаму спецыялісту купілі камп’ютар, усталявалі патрэбныя праграмы. Напачатку работнікі старэйшага веку нават мышку баяліся браць у рукі. Навучыліся! Новыя тэхналогіі і праграмы значна спрашчаюць работу, але аб’ёмы яе вялікія.

– Ці здараліся ў вашай рабоце памылкі і як вы да гэтага ставіцеся?

Яніна Станіславаўна:

– Нездарма кажуць: не памыляецца той, хто не працуе. Я таксама памылялася. Важна разумець спецыфіку работы бухгалтара: адна пераблытаная лічба грунтоўна ўплывае на вынік усёй справаздачы. Лічу, што да гэтага трэба ставіцца спакойна і імкнуцца надалей быць больш пільным, па некалькі разоў правяраць унесеныя дадзеныя.

– Які перыяд на працягу года вам падабаецца найбольш і найменш і чаму?

Яніна Станіславаўна:

– Самы напружаны час у мяне ад студзеня па канец сакавіка. Балансы, уся гадавая справаздачнасць, інвентарызацыі на фермах і складах, планаванне ўліковай палітыкі на новы год – пералік можна доўга працягваць. Работы вельмі шмат. Мяне зразумее любы бухгалтар.

Па душы вясна. Калі прачынаецца прырода, пачынае зелянець трава і набухаюць на дрэвах пупышкі. Асабліва люблю май, калі цвітуць сады. Ля дома шмат кветак – гэта мая аддушына.

– Якую прафесійную ролю хацелі б прымерыць?

Яніна Станіславаўна:

– Столькі гадоў на адным месцы, што мне нават тэарэтычна складана сябе ўявіць у іншай галіне.

Педагогам ці дызайнерам дакладна не была б. Магчыма, стала б тэрапеўтам альбо медсястрой.

– Што папрасілі б у залатой рыбкі?

Яніна Станіславаўна:

– Здароўя для сябе, блізкіх і ўсіх людзей. Усё астатняе – другаснае.

– Кажуць, кіраўнік (старшыня) на вёсцы – бацька, дзядзька і суддзя. Хто ў такім разе галоўны бухгалтар?

Яніна Станіславаўна:

– У першую чаргу фінансіст, а ў другую – памочнік «бацькі, дзядзькі і суддзі». На нас – зарплаты, падаткі, своечасовая выплата лізінгаў… Хтосьці з вялікіх казаў, што бухгалтар – чалавек, які вырашае ўсе вашы праблемы, пра якія вы не ведалі, незразумелым для вас шляхам. Нешта ў гэтым ёсць. Насамрэч мая прафесія цікавая, не пазбаўленая творчага падыходу.

Слова калегам

Аксана Бугай, намеснік галоўнага бухгалтара КСУП «Гудагай»:

– У 2012 годзе наш СВК імя Гашкевіча далучылі да СВК «Гудагай». Цэнтральнай сядзібай вырашылі зрабіць не Палушы, а Малі. Была бухгалтарам, пасля ўзбуйнення гаспадаркі прызначылі намеснікам галоўнага бухгалтара. З Янінай Станіславаўнай працуем 10 гадоў – яна адказна ставіцца да работы, таму ў яе заўсёды ў справах парадак.

https://www.ostrovets.by
Тэкст: Алёна Ганулич
Фото: Алена Ганулич